ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (853) ● Чацвер, 8 чэрвеня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

## В'ЕТНАМ ПЕРАМОЖА!

Мітынг, прысвечаны трэцяй гадавіне з дня ўтварэння Часовага рэвалюцыйнага ўрада Рэспублікі Паўднёвы В'етнам, адбыўся ў актавай зале галоўнага корпуса. Перад прысутнымі—студэнтамі, прадстаўнікамі гераічнага народа В'етнама, якія вучацца на падрыхтоўчым факультэце, выкладчыкамі і супрацоўнікамі выступілі дацэнт гістарычнага факультэта М. Г. Елісееў, студэнтка Валянціна Мядзведзева. Яны выказалі ўпэўненасць, што справа міру на шматпакутнай зямлі В'етнама пераможа.

Удзельнікі мітынгу прынялі рэзалюцыю, у якой з гневам і абурэннем асуджаюць ганебную агрэсію амерыканскага імперыялізму ў В'етнаме і заклікаюць моладзь усяго свету змагацца за вывад амерыканскіх войск з Індакітая. Палымяным заклікам гучалі словы «Рукі прэч ад В'етнама!», «В'етнам пераможа!».

**М. МАЦЕЙКА.**

ДА 50-ГОДДЗЯ УТВАРЭННЯ СССР

## КАЛЕКТЫЎ КАФЕДРЫ—ЮБІЛЕЮ

Калектыў кафедры навуковага камунізму імкнецца дастойна сустрэць вялікае свята шматнацыянальнага савецкага народа—50-годдзе ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік,

У сакавіку на кафедры было ўсебакова абмеркавана пытанне аб развіцці нацыянальных адносін у СССР на сучасным этапе, распрацаваны і зацверджаны канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнню вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і палітыка-выхаваўчай работы ў сувязі з юбілеем.

З улікам важнейшых палажэнняў, што вынікаюць з пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння СССР». навейшай літаратуры і перыядычнага друку рыхтуюцца і лекцыі па курсу навуковага камунізму «Нацыі і нацыянальныя адносіны ў перыяд будаўніцтва сацыялізму і камунізму». Прыкметна ўзрасла зацікаўленасць студэнтаў да семінарскіх заняткаў, асабліва па тэме «Камунізм і нацыі», пры абмеркаванні якой былі заслуханы такія даклады і рэфераты: «Міжнароднае значэнне вопыту КПСС у будаўніцтве многанацыянальнай дзяржавы», «Беларускі народ у братняй сям'і народаў СССР». «Крытыка буржуазных і апартуніцкіх тэорый, фальсіфікуючых нацыянальную палітыку КПСС і Савецкай дзяржавы», «XXIV з'езд КПСС аб задачах далейшага развіцця савецкай многанацыянальнай літаратуры» і іншыя.

У экзаменацыйных білетах расшырана колькасць тэм па нацыянальнаму пытанню, у тым ліку: «Вырашэнне нацыянальнай праблемы — вялікая заваёва сацыялізму»; «Пастанова ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», «Савецкі народ — новая гістарычная супольнасць людзей», «Нацыяналізм — галоўная зброя імперыялізму ў барацьбе супраць адзінства сацыялістычных краін». Для студэнтаў філолагаў і журналістаў, якія здаюць дзяржэкзамен па навуковаму камунізму, прачытана 8 аглядных лекцый, адна з якіх спецыяльна прысвечана пастанове ЦК КПСС аб падрыхтоўцы да 50-годдзя СССР. Акрамя гэтага, на кафедры падрыхтавана і абмеркавана метадычная распрацоўка «Камунізм і нацыі», састаўлена прыкладная тэматыка курсавых і дыпломных работ студэнтаў, якая ўключае 19 назваў: «Сацыялізм і развіццё нацый», «Ленінская нацыянальная палітыка КПСС і ўмацаванне дружбы народаў СССР», «Асноўныя заканамернасці развіцця сацыялістычных нацый у працэсе камуністычнага будаўніцтва», «Здзяйсненне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў Савецкай Беларусі» і іншыя.

Па заданню рэспубліканскага таварыства «Веды» на кафедры падрыхтавана і выдадзена брашура «XXIV з'езд КПСС аб заканамернасцях развіцця сацыялістычных нацый». Запланавана ў гэтым годзе выдаць такія артыкулы, як «Савецкі народ—новая гістарычная супольнасць людзей», «Сучасны рэвалюцыйны рух і нацыянальнае пытанне», «Спалучэнне прынцыпаў сацыялістычнага інтэрнацыяналізму і патрыятызму ў здзяйсненні ленінскай нацыянальнай палітыкі», «Выхаванне студэнтаў у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму і сацыялістычнага патрыятызму». Адзін з аспірантаў кафедры даследуе ўзаемаўплыў і ўзаемаўзбагачэнне нацыянальных культур у працэсе камуністычнага будаўніцтва (на прыкладзе Беларусі і Украіны).

Выкладчыкі кафедры выступалі з лекцыямі ў радзе гарадоў рэспублікі (Барысаве, Баранавічах, Брэсце, Стаўбцах і іншых), на прамысловых прадпрыемствах і ў сярэдніх школах г. Мінска. Імі распрацаваны планы тэарэтычных канферэнцый для некаторых партыйных арганізацый прадпрыемстваў.

Спадзяёмся, што ў наступным навучальным годзе наша праца па дастойнай сустрэчы 50-годдзя СССР будзе яшчэ больш плённай.

**І. СЯМЫКІН, П. СІЛІВАНЧЫК,**
**дацэнты кафедры навуковага камунізму.**



*НА ЗДЫМКУ: сваю перадыпломную практыку студэнт IV курса біялагічнага факультэта Сяргей Усанаў праходзіць на кафедры біяхіміі.*

## ПЕРШЫ ВЫПУСК

**Закончылі работу курсы падрыхтоўкі рэзерву прапагандысцкіх кадраў для сістэмы партыйнай і камсамольскай асветы. Курсы былі створаны на базе гістарычнага факультэта і ўкамплектаваны лепшымі студэнтамі III і IV курсаў гістарычнага, філасофскага аддзяленняў і аддзялення палітычнай эканоміі.**

**Сіламі прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта і работнікаў Мінскага абласнога Дома партыйнай асветы са слухачамі было праведзена 18 лекцыйных і практычных заняткаў. Асабліва многа ўвагі рабоце з маладымі прапагандыстамі ўдзялялі прафесар Р. А. Левін і дацэнт К. М. Драчоў.**

**Слухачы добрасумленна адносіліся да заняткаў, набылі пэўныя навыкі агітацыйна-прапагандысцкай работы. Загадам рэктара 83 студэнтам-слухачам курсаў была прысвоена кваліфікацыя «прапагандыст сістэмы партыйнай і камсамольскай асветы». Лепшыя з іх—Г. Мурашкіна, І. Карніенка. К. Кляўдо, А. Ханевіч, С. Камарова, В. Плячысцік — узнагароджаны грашовай прэміяй.**

**У новым навучальным годзе курсы будуць дзейнічаць на базе некалькіх факультэтаў. З улікам атрыманага вопыту палепшыцца праграма курсаў, арганізацыя заняткаў.**

**А. ТОЗІК,**
**член савета курсаў.**

## ТАК ТРЫМАЦЬ!

З ранку выстройваюцца ў бібліятэцы доўгія чэргі студэнтаў, позна не гаснуць вокны студэнцкіх інтэрнатаў. Сесія... Паступова падыходзіць да канца доўгая чарада залікаў, пачынаюцца першыя экзамены.

І ў які б з карпусоў універсітэта мы сёння ні заглянулі — усюды ўбачым групы ўсхваляваных студэнтаў каля дзвярэй з надпісам: «Цішэй, ідзе экзамен!»

Вось і тут, на трэцім паверсе хімічнага корпуса, экзамен па марксісцка-ленінскай філасофіі ў адной з груп II курса хімічнага факультэта. Прадмет складаны. Аб'ём пройдзенага за семестр матэрыялу вялікі. Не дзіўна, што студэнты хвалююцца.

Пасля дружных наказаў рабяты адпраўляюць за дзверы аўдыторыі, у якой ідзе экзамен, высокага хлопца — гэта Сяргей Петраш. Адчуваецца, як студэнты групы хвалюцца не толькі за свае адзнакі, але і за адзнакі сяброў. Сяргей Філімонаў ужо атрымаў пяцёрку і чакае, з чым выйдзе сябар. А вось і ён.

— Ну, як?

— Пяцёрка!

Сябры моцна цісНуць адзін аднаму рукі.

І так сустракалі кожнага здаўшага ў гэты дзень экзамен. Агульны вынік у групе нядрэнны: дзевяць пяцёрак і толькі адна тройка.

Больш таго, відаць, што філасофію рабяты вывучаюць не проста для адзнакі, але і таму, што навука гэта глыбока іх зацікавіла і захапіла. Я ў гэтым пераканаўся, калі ўбачыў, як пасля экзамена студэнты акружылі сваіх выкладчыкаў Юрыя Аляксеевіча Гусева і Ігара Іосіфавіча Шацілу. Разгарэлася цікавая дыскусія.

Экзамены пачаліся. Яны павінны выявіць не толькі якасць падрыхтоўкі студэнтаў, але і сілу іх дружнай падтрымкі, ступень захаплення, без якіх нельга ўявіць сабе сапраўднага студэнта.

**С. ПЯТКОЎСКІ,**
**студэнт.**

## У АБ'ЕКТЫВЕ «АБ'ЕКТЫВА»

**Як толькі пачынаецца сесія, на стэндах кожнага факультэта паяўляюцца экраны паспяховасці, на якіх рознакаляровымі алоўкамі выстаўляюцца адзнакі—ад двойкі да пяцёркі. Толькі не часта студэнты звяртаюць на экран увагу: ужо прывыклі. Аднак міма «Аб'ектыва», органа акадэмічнага сектара камітэта камсамола біяфака, раўнадушна не пройдзеш.**

**Малюнкі, схемы вельмі наглядна расказваюць пра ход сесіі ў біёлагаў. Так, падводзячы вынікі экзаменаў на IV курсе, побач з поспехамі адзначаны прозвішчы тых, хто меў пераздачы, не быў дапушчан да сесіі, мае «хвасты».**

**Вельмі моцнае, але зусім не радаснае ўражанне пакідае табліца-графік «З якім «грузам» пераздач прыйшлі да сесіі некаторыя студэнты». Ды і дзе ж будзеш радавацца, калі сем студэнтаў маюць больш дзесяці пераздач. У газеце іх назвалі «цудоўнай сямёркай». Мяркуйце самі: студэнты V курса Пешчанка і Піятух маюць адпаведна 16 і 20 пераздач, Іванюценка (IV курс) — 14, Бірыла (III курс) — 15 і г. д. Шмат студэнтаў маюць да 10 пераздач. Хочацца спадзявацца, што газета не спыніцца толькі на абнародаванні фактаў, а і паведаміць аб прынятых да гэтых студэнтаў мерах.**

**Дала рэдкалегія і ўзоры студэнцкай мудрасці, накшталт: «добра смяецца той, хто атрымлівае стыпендыю»; «рыба гніе з галавы, а студэнт з «хваста».**

**Л. ДРУЗЕВА.**



*НА ЗДЫМКАХ: экзамен па вышэйшай алгебры ў студэнтаў I курса аддзялення радыёфізікі. Яго прымае дацэнт Р. Ф. АПАЦЕНАК.*

Фота **Д. Чаховіча.**



# СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ № 7

## ПА ВЫНІКАХ АГЛЯДУ...

**З 5 ПА 15 МАЯ ва універсітэце праведзен ІІ агляд сродкаў галоснасці ў рабоце факультэцкіх груп народнага кантролю. У яго задачу ўваходзіла: ацаніць стан галоснасці як важнейшага прынцыпу дзейнасці груп народнага кантролю; устанавіць, як у рабоце груп выкарыстоўваюцца розныя формы галоснасці.**

**Правільна разумеюць і пастаянна выкарыстоўваюць прынцып галоснасці групы народнага кантролю хімічнага, фізічнага, геаграфічнага факультэтаў і факультэта журналістыкі. Гэтыя групы маюць добрыя стэнды, на якіх вывешваюцца спісы членаў ГНК, планы работы, вынікі праводзімых праверак. Добра пастаўлен і ўлік праведзенай работы ў гэтых групах.**

**Аднак агляд паказаў, што не ўсе групы выкарыстоўваюць прынцып галоснасці. Да гэтай пары не маюць стэндаў групы народнага кантролю матэматычнага факультэта, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, падрыхтоўчага факультэта. На стэндзе выдавецтва няма ні спісу членаў ГНК, ні плана работы, ні вынікаў праверак і абмеркаванняў.**

**На ваеннай кафедры добры стэнд выкарыстоўваецца не па назначэнню [там можна ўбачыць пералік бібліятэчных запазычнікаў], вывешан толькі спіс членаў ГНК, і гэта ўсё.**

**Неабходна адзначыць, што факультэцкія ГНК зусім не выкарыстоўваюць такую важную форму галоснасці, як публікацыя матэрыялаў у факультэцкіх насценных газетах і ва універсітэцкай шматтыражцы.**

**Старшыні і члены многіх груп нерэгулярна выступаюць на партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх сходах са справаздачамі аб выніках работы і прынятых мерах для ліквідавання ўскрытых недахопаў.**

**Камісія, праводзіўшая агляд сродкаў галоснасці, вырашыла першае месца не прысуджаць ні адной з груп.**

**ІІ месца прысуджана ГНК хімічнага факультэта, ІІІ—ГНК факультэта журналістыкі, старшыні якіх М. В. Кніга і В. І. Дубовік узнагароджаны ганаровымі граматамі універсітэта.**

**Е. АКІНЧЫЦ,**
**старшыня камісіі па праверцы сродкаў галоснасці,**
**намеснік старшыні ГНК БДУ.**

## СКЛАДАЕМЫЯ ПОСПЕХУ

ПРАЙШЛО больш паўгода з моманту выбрання факультэцкіх груп народнага кантролю, і нам неабходна падвесці першыя вынікі іх працы, каб на аснове крытычнага аналізу вызначыць новыя задачы, далей удасканальваць формы і метады кантрольнай дзейнасці.

Нядаўна універсітэцкая група народнага кантролю азнаёмілася з работай усіх факультэцкіх груп. Прыемна адзначыць, што большасць з іх сталі больш актыўна выконваць тую важную задачу, якая пастаўлена перад імі — дапамагаць партыйным арганізацыям, адміністрацыі дабівацца на ўсіх участках вытворчасці, упраўлення і абслугоўвання стварэння абставін, якія выключылі б магчымасць праяўлення безгаспадарчасці і марнатраўства, парушэння дзяржаўнай і вытворчай дысцыпліны, сацыялістычнай законнасці. Да такіх трэба аднесці групы народнага кантролю фізічнага факультэта (старшыня Н. М. Хаўратовіч), хімічнага (старшыня М. В. Кніга), біялагічнага (старшыня А. М. Сташкоў), геаграфічнага (старшыня Д. М. Карулін), журналістыкі (старшыня В. І. Дубовік), філалагічнага (старшыня В. А. Захарава). Не з поўнай аддачай працуюць групы народнага кантролю юрыдычнага факультэта (старшыня А. В. Дулаў), прыкладной матэматыкі (старшыня Н. А. Лукашэвіч), падрыхтоўчага (старшыня Л. Ф. Сакавец), гістарычнага (старшыня П. А. Літвіноўскі).

Неабходна сказаць аб тым, што і ў рабоце добрых груп, і ў рабоце груп, якія не праявілі пакуль асаблівай актыўнасці, не дасягнут той узровень дзейнасці, эфектыўнасці кантролю, які адпавядае патрабаванням сённяшняга дня. А таму ўяўляе цікавасць размова аб тых складаемых, якія забяспечваюць поспех работы груп народнага кантролю.

Перш за ўсё работа павінна весціся планава, мэтанакіравана, рытмічна, без спадаў і затуханняў. Кантроль — пастаянна дзейсная зброя. Выкарыстоўваць яе трэба не толькі ў барацьбе з недахопамі, але і для прапаганды, укаранення лепшых узораў работы членаў нашага калектыву.

Кантроль павінен насіць баявы, наступальны характар. Народныя кантралёры— не простыя рэгістратары падзей, адмоўных або станоўчых фактаў. Іх работа зварнута да будучага, і яны павінны дапамагаць партыйным арганізацыям і кіраўніцтву факультэтаў «расшываць вузкія месцы», «развязваць вузлы» на шляху да новых поспехаў у пастаноўцы вучэбнай і навукова-даследчай работы.

Не трэба гнацца за колькасцю праверак. Галоўнае— актуальнасць і якасць, глыбіня праверкі. Патрэбны не фармальныя або, гаворачы словамі У. І. Леніна, «славесныя» праверкі, а такія, якія дазваляюць дакапвацца да сутнасці справы, знаходзіць канкрэтных асоб, вінаватых у парушэннях, промахах, якія не выконваюць сваіх службовых абавязкаў, праяўляюць бязрукасць у рабоце. Патрэбны праверкі, у выніку якіх лепшыя ўзоры работы будуць узяты на ўзбраенне ўсімі членамі калектыву факультэта або нават універсітэта. А таму неабходна старанна прадумаць методыку правядзення кожнай праверкі і ўзброіць кантралёраў адпаведнымі праграмамі або памяткамі з пералікам асноўных пытанняў.

Вельмі важна, каб усе члены групы народнага кантролю мелі пастаянны ўчастак работы, ведалі, што ім даручана кантраляваць і за які ўчастак работы яны нясуць адказнасць як перад групай народнага кантролю, так і перад членамі калектыву факультэта, якія даверылі ім адказныя функцыі. І тут трэба сказаць, што далёка не ва ўсіх факультэцкіх групах кантралёры маюць пастаянныя даручэнні. Няма гэтага, напрыклад, у групах філалагічнага, гістарычнага факультэтаў, а таксама факультэта прыкладной матэматыкі.

Важна не толькі правільна арганізаваць работу народных кантралёраў, але і наладзіць узаемадзеянне з кантралёрамі прафсаюзных арганізацый, камсамольскімі «пражэктарыстамі», прыцягваць да праводзімых праверак актыў. Сіламі адных народных кантралёраў многія пытанні жыцця факультэта цяжка вывучыць належным чынам і выказаць найбольш мэтазгодныя рэкамендацыі.

Асаблівыя клопаты групы павінны праяўляць аб устанаўленні пастаянных і дзелавых кантактаў з камсамольскімі «пражэктарыстамі», якія прадстаўляюць амаль дзесяцітысячную армію студэнтаў універсітэта. Аб тым, што гэтых кантактаў у нас пакуль няма ў большасці факультэцкіх груп, сведчыць публікуемы сёння артыкул намесніка начальніка штаба «КП» універсітэта В. Курыленкава.

Цяжка дабіцца поспеху без сістэматычнага імкнення кантралёраў павысіць свой тэарэтычны і практычны ўзровень, пастаянна вучыцца, але далёка не ўсе старшыні факультэцкіх груп і не ўсе народныя кантралёры ўсвядомілі гэта. Так, напрыклад, 19 красавіка перад народнымі кантралёрамі універсітэта выступаў загадчык аддзела навукі і культуры Камітэта народнага кантролю БССР О. А. Здаравенін са змястоўным дакладам «Аб задачах груп народнага кантролю ў вышэйшых навучальных установах». Аднак амаль палова старшынь груп і народных кантралёраў на дакладзе, на жаль, не прысутнічала.

Немалаважнае значэнне мае старанная падрыхтоўка рашэння групы народнага кантролю. І змест і форма яго павінны быць такімі, каб рэкамендацыі былі дзейснымі, каб рашэнне прынесла канкрэтны вынік — садзейнічала ліквідаванню адзначаных недахопаў або шырокаму распаўсюджанню станоўчага вопыту.

Паспяховае рашэнне задач народнага кантролю ў многім залежыць ад пастаяннага і ўмелага выкарыстання сродкаў галоснасці. Чым больш члены калектыву будуць ведаць аб планах і практычных справах народных кантралёраў, тым больш яны будуць памагаць дазорным, тым лепш партыйная арганізацыя і кіраўніцтва факультэта будуць адчуваць біццё пульса калектыву.

У сённяшняй «Старонцы народнага кантролю» падводзяцца вынікі нядаўна прайшоўшага II агляду сродкаў галоснасці. Яны гавораць аб тым, што не ўсе старшыні груп аддаюць галоснасці належную ўвагу.

Поспех дзейнасці груп народнага кантролю знаходзіцца ў прамой залежнасці ад таго, наколькі настойліва яны дабіваюцца рэалізацыі сваіх прапаноў і рэкамендацый. Нельга спадзявацца толькі на сілу паперы — распрацавалі рэкамендацыі або прапановы, перадалі іх у дэканат або партбюро і заспакоіліся, — а дабівацца своечасовага разгляду і прыняцця мер. А ў нас ёсць такія групы (напрыклад, геаграфічнага, юрыдычнага факультэтаў), якія не заўсёды праяўляюць неабходную настойлівасць.

Важна, нарэшце, падкрэсліць, наколькі вялікае значэнне мае паўсядзённае і ўмелае кіраўніцтва з боку партыйных арганізацый, якія адпаведна «Палажэнню аб органах народнага кантролю СССР» прызваны аказваць групам народнага кантролю ўсямерную падтрымку і дапамогу ў рабоце. Гэтая падтрымка і ўвага праяўляюцца ў тым, што партыйныя арганізацыі выносяць на абмеркаванне партыйных сходаў асноўныя пытанні дзейнасці груп, падтрымліваюць іх абгрунтаваныя прапановы і вывады. Дабіваючыся паляпшэння работы груп, важна ўзняць адказнасць камуністаў, надзеленых высокім давер'ем і званнем дазорных народа, заслухоўваць іх справаздачы і паведамленні аб выкананні партыйнага даручэння, адзначаць тых, хто добрасумленна, ініцыятыўна і прынцыпова здзяйсняе кантрольныя функцыі, і строга пытаць з тых камуністаў, якія праяўляюць пасіўнасць.

І тут трэба сказаць аб тым, што партыйныя арганізацыі раду факультэтаў (прыкладной матэматыкі, гістарычнага, юрыдычнага, падрыхтоўчага) за прайшоўшыя паўгода не праяўлялі належнай увагі да работы груп народнага кантролю, што адбілася на актыўнасці іх работы.

Спадзяемся, што факультэцкія групы народнага кантролю падвядуць вынікі работы за першае паўгоддзе, намецяць канкрэтныя шляхі ліквідавання допушчаных недахопаў і тым самым будуць актыўна садзейнічаць дасягненню новых поспехаў калектывам універсітэта, які рыхтуецца дастойна сустрэць 50-годдзе з дня ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**намеснік сакратара парткома, старшыня ГНК універсітэта.**

## ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ

Хоць да летніх канікул яшчэ нямала часу і вузаўскаму дазорнаму думаць аб адпачынку ранавата, аднак папярэднія вынікі сваёй работы падвесці, бадай, ужо можна.

Група народнага кантролю журфака, у саставе якой пяць чалавек—два выкладчыкі і тры студэнты—пад кіраўніцтвам партыйнага бюро ў бягучым навучальным годзе сканцэнтравала ўвагу на радзе важных пытанняў. Асноўныя з іх: удзел студэнтаў і выкладчыкаў у асенніх сельскагаспадарчых работах 1971 года; правільнасць размеркавання сярод студэнтаў стыпендый і месц у інтэрнаце і падтрыманне парадку ў ім; наведванне заняткаў студэнтамі і дакладнасць уліку пропускаў старастамі груп і курсаў; размеркаванне і выкананне вучэбнай нагрузкі сярод выкладчыцкага саставу і выкарыстанне працоўнага часу вучэбна-дапаможным персаналам; матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне навучальнага працэсу на факультэце.

**Па выніках некаторых праверак дэканат неадкладна прыняў канкрэтныя меры.**

**Але вось ёсць пытанні, вырашэнне якіх—ні цяпер, ні пазней—дэканату не пад сілу. На два з іх мне і хочацца звярнуць увагу.**

**Першае датычыцца інтэрната. Справа ў тым, што ў пакоях, дзе жывуць студэнты журфака, за рэдкім выключэннем, няма неабходных рэчаў: графінаў для вады, радыёкропак і рэпрадуктараў, не хапае крэслаў. Патрабуюць замены коўдры і матрацы. Аб усім гэтым група народнага кантролю дакладвала прарэктару па адміністрацыйна - гаспадарчай частцы, але становішча мала змянілася.**

**Другое пытанне—матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне навучальнага працэсу. Фоталабараторыя пастаянна адчувае недахоп фотаматэрыялаў, асабліва фотапаперы, а аддзел забеспячэння адміністрацыйна - гаспадарчай часткі заявак не выконвае.** З прычыны працяглай эксплуатацыі некаторае абсталяванне (павелічальнікі і іншае) прыйшло ў непрыгоднасць. Лабараторыя радыё і тэлебачання тры гады чакае заказаных ёю 10 магнітафонаў «Рэпарцёр-5»; тут вельмі патрэбна асобная тэлестудыя, але няма памяшкання, няма тэхніка па тэлеапаратуры. Некалькі год вядуцца размовы аб неабходнасці факультэцкай друкарні, але арганізацыя яе пакуль і не прадбачыцца: няма ні памяшкання, ні лінатыпа, ні стандартных альбомаў шрыфтаў, ні макетаў, ні паперы для іх прыгатавання. І як вынік, заняткі па тэхніцы вытворчасці і афармлення газеты даводзіцца праводзіць чыста тэарэтычна.

Спадзяемся, што голас народных кантралёраў будзе пачут, і факультэт атрымае неабходную дапамогу.

В. ДУБОВІК,
старшыня ГНК.

## СВЯЦІЦЬ ЯРЧЭЙ!

**У красавіку гэтага года штаб «Камсамольскага пражэктара» універсітэта правёў рэйд, каб высветліць становішча спраў у факультэцкіх штабах «КП».**

**Штабы «КП» створаны на ўсіх факультэтах, выключаючы хімічны. Такім чынам, тут кантралёрская работа «пражэктарыстамі» не вялася. Вінаваты ў гэтым толькі сакратар камітэта камсамола Алег Шадыра, які неаднаразова абяцаў выправіць сваё ўпушчэнне, але абяцанне так і не выканаў. Не ва ўсіх створаных штабах «КП» работа вядзецца на высокім узроўні. Гэта тлумачыцца тым, што актывісты факультэцкіх штабаў недастаткова добра ўсведамляюць галоўную задачу «Камсамольскага пражэктара», мала выкарыстоўваюць такія метады работы, як рэйды і праверкі, не кантралююць ліквідаванне недахопаў, аб якіх паведамляюць нумары «КП».**

**Цяпер кожнаму факультэцкаму штабу «КП» перададзена палажэнне аб «Камсамольскім пражэктары». Яно дапаможа «пражэктарыстам» правільна накіраваць сваю работу.**

**З мэтай больш аператыўнага атрымання інфармацыі на патоках створаны пасты «Камсамольскага пражэктара». Паточных пастоў «КП» няма толькі на біяфаку і журфаку.**

**Калі гаварыць аб журфаку, то выпускам «КП» тут займаецца толькі старшыня штаба «КП» Уладзімір Трусаў. Хоць нумары «КП», зробленыя ім у вершаванай форме і з малюнкамі, выклікаюць добрае ўражанне, але работу яго як кіраўніка факультэцкай групы «КП» [яна існуе толькі фармальна і ў выпуску нумароў не прымае ўдзелу] трэба прызнаць нездавальняючай. Аналагічнае становішча складвалася да нядаўняга часу і на філфаку, дзе старшыня штаба «КП» т. Крачкоўскі. На дрэнную работу «КП» звярнулі ўвагу партыйная і камсамольская арганізацыі філфака, а таксама універсітэцкі штаб «КП», і становішча прыкметна палепшылася.**

**Работа ў факультэцкіх штабах «КП» вядзецца па планах, выключаючы штабы «КП» юрфака, журфака, геафака. Кожны факультэцкі штаб мае свой орган насценнага друку. У выпусках «КП» асвятляюцца наведванне заняткаў, жыццё студэнтаў у інтэрнатах, дысцыпліна камсамольцаў, спартыўная работа, дзейнасць агітбрыгад, крытыкуюцца запазычнікі і г. д. Большасць штабаў «КП» выпускае «Маланкі» або «Баявыя лісткі», якія прысвячаюцца найбольш злабадзённым пытанням.**

**Праўда, штабы «КП» сутыкаюцца з немалымі цяжкасцямі, якія ўплываюць на якасць работы. Няма фоталабараторый, дзе можна было б рабіць фатаграфіі для нумароў «КП»; няма фотаапаратаў і фотаўспышак; няма сродкаў на закупку фотаматэрыялаў і хімрэактываў, тушы, фарбаў і г. д. Асабліва цяжка даставаць паперу для нумароў «КП».**

**Не заўсёды ўдачны падбор «пражэктарыстаў». Ад іх жа патрабуецца не толькі веданне справы, але і высокая прынцыповасць, вынаходлівасць, настойлівасць, смеласць.**

**Работу «КП» накіроўваюць групы народнага кантролю і партыйныя арганізацыі факультэтаў. Выключэнне складаюць геафак і біяфак.**

**Калі падвесці вынік сказанаму, то стане зразумела, што штабу «КП» універсітэта і факультэцкім штабам давядзецца яшчэ многа зрабіць, каб «Камсамольскі пражэктар» стаў актыўным барацьбітом з усякага роду недахопамі ў камсамольскай рабоце, арганізацыі быту і адпачынку студэнтаў. Яшчэ больш увагі трэба ўдзяліць выпуску «Маланак» і «Баявых лісткоў», так як важнай умовай паспяховай работы з'яўляецца шырокая галоснасць.**

**Задача ж не толькі ў тым, каб выявіць допушчаныя парушэнні і недахопы, але і пракантраляваць, як іх ліквідоўваюць, паклапаціцца аб тым, каб папярэдзіць узнікненне недахопаў.**

**Асновай паспяховай дзейнасці «КП» з'яўляюцца шырокая ініцыятыва і самадзейнасць камсамольцаў, іх гарачы энтузіязм, цвёрдая ўпэўненасць у важнасці сваёй работы.**

**В. КУРЫЛЕНКАЎ,**
**намеснік начальніка штаба «КП» БДУ.**

# МЕДАЛІ МАЛАДЫМ ВУЧОНЫМ

**З мэтай заахвочвання маладых вучоных з гэтага года ўстаноўлены тры медалі Акадэміі навук СССР з прэміямі ў размеры 200 рублёў кожная за лепшыя навуковыя працы. Медалі з прэміямі прысуджаюцца Прэзідыумам Акадэміі навук СССР кожны год у снежні месяцы. Да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне медаляў з прэміямі дапускаюцца навуковыя і навукова-тэхнічныя супрацоўнікі, выкладчыкі, стажоры-даследчыкі, аспіранты навукова-даследчых і вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый не старэй 33 год.**

**Аб прадстаячых конкурсах Акадэмія навук СССР публікуе паведамленні ў «Весніку АН СССР», «Вестках АН СССР» адпаведнай серыі, «Весніку вышэйшай школы», «Комсомольской правде».**

**Права вылучаць кандыдатаў на атрыманне медаляў з прэміямі прадастаўляецца: вучоным саветам навуковых устаноў і вышэйшых навучальных устаноў, міністэрствам, ведамствам, акадэміям навук саюзных рэспублік, аддзяленням АН СССР, тэхнічным саветам прамысловых прадпрыемстваў і канструктарскіх бюро.**

**Арганізацыі, вылучыўшыя кандыдата на атрыманне медаля з прэміяй, абавязаны не пазней кастрычніка прадставіць у адпаведную секцыю Прэзідыума АН СССР з надпісам: «На атрыманне медаля з прэміяй за работу па тэме...» матываванае прадстаўленне, якое ўключае навуковую характарыстыку работы; апублікаваную навуковую работу (серыю работ); матэрыялы навукова адкрыцця або вынаходніцтва ў 3-х экземплярах; звесткі аб аўтару (пералік асноўных навуковых работ, адкрыццяў, вынаходніцтваў, месца работы і займаемая пасада, год нараджэння...).**



*Падыходзяць к канцу заняткі на падрыхтоўчым факультэце. Яшчэ раз правяраюць свае веды перад сесіяй студэнты-в'етнамцы.* Фота **М. Нечыпарэнкі.**

Х УТКА на кафедры неарганічнай хіміі пачнецца абарона дыпломных работ. Але ўжо напярэдадні абароны можна сказаць, што студэнцкія даследаванні праводзіліся па актуальных тэмах і маюць пэўны інтарэс для прамысловасці.

Асноўная накіраванасць дыпломных работ дыктуецца задачамі кафедры, а яе калектыў у апошні час найбольшую ўвагу ўдзяляе даследаванню фотахімічных працэсаў у цвёрдых рэчывах.

Ад сённяшняга дыпломніка патрабуецца вельмі многа, бо яго апошняя праца ва універсітэце — выпрабаванне на сталасць. Да яго студэнты рыхтуюцца з самага пачатку навучання ва універсітэце. Яны прывучаюць сябе карпець у лабараторыях, цярпліва весці даследаванні, дабівацца патрэбнага выніку. Каб напісаць добрую работу, дыпломніку неабходна прасачыць дзесяткі эксперыментаў, зрабіць творчы аналіз пэўнай навуковай з'явы, умела абгрунтаваць практычныя пошукі. Многія з дыпломнікаў кафедры неарганічнай хіміі маюць сувязь з заводскімі лабараторыямі, праходзяць там сваю вучэбную практыку. Сумяшчэнне практычных даследаванняў у лабараторыях кафедры і вытворчасці прыносіць адпаведныя вынікі. Такая ўзаемасувязь дае магчымасць звярнуць больш увагі на практычную накіраванасць дыпломных работ, на ўкараненне навуковых вынікаў у практыку. Яна з'яўляецца ступенькай будучага спецыяліста ў вытворчасць.

Цяпер заканчвае вырашэнне сваёй тэмы студэнтка Людміла Мялёхіна. Яна сінах тэмай «Бессярэбранае праяўленне слаёў, змяшчаючых малую колькасць серабра». Вынікі пошукаў дыпломніцы маюць навуковую цікавасць. У працэсе напісання дыпломнай яна бліжэй пазнаёмілася з методыкай работы над праблемай, асвоіла складаныя прыборы.

# ВЫПРАБАВАННЕ НА СТАЛАСЦЬ

змагла атрымаць і вывучыць уласцівасці тонкіх плёнак двухвокісу крэмнію, якія знойдуць шырокае прымяненне ў вытворчасці. Настойлівыя даследаванні прынеслі вельмі цікавыя вынікі, атрыманыя з дапамогай новых метадаў электроннай мікраскапіі. Л. Мялёхіна прасачыла працэсы ўтварэння і росту плёнкі.

Студэнты В. Сакалоў і П. Ступакоў таксама атрымалі цікавыя вынікі, якія могуць знайсці практычнае прымяненне.

У лабараторыі электроннай мікраскапіі заканчвае сваю работу студэнтка пятага курса С. Вараб'ёва пад кіраўніцтвам аспіранткі Т. Н. Вараб'ёвай. Яна працуе над важнай у практычных адносінах...

Многія студэнты з кафедры неарганічнай хіміі застануцца працаваць на тых заводах, дзе праходзілі вучэбную практыку і пісалі свае дыпломныя работы.

Спецыяліст павінен прыйсці на вытворчасць усебакова падрыхтаваным, мець не толькі шырокую тэарэтычную, навуковую падрыхтоўку, але і ўмець выкарыстаць атрыманыя веды на практыцы, з першых дзён адчуць сябе гаспадаром спецыяльнасці, здольным правільна арыентавацца ў сучасных праблемах вытворчасці. Менавіта такіх спецыялістаў стараецца рыхтаваць калектыў кафедры неарганічнай хіміі.

**У. КАПУЗА,**
**студэнт.**



Экзамен па матэматыцы ў студэнтаў І курса геаграфічнага факультэта прымае ст. выкладчык **Л. С. Лаўрыновіч.**

![Камсамольскае жыццё]

**Камсамольскае жыццё**

# ВЕСТКІ З КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

Першага чэрвеня адбылася нарада камандзіраў цалінных будаўнічых атрадаў. Выявілася, што лепш за ўсіх гатоў да выезду атрад гістарычнага факультэта «Цаліны» (камандзір Савэйтан). Многія атрады падрыхтаваны не поўнасцю. Асаблівую трывогу выклікае медагляд: байцы некаторых атрадаў яшчэ нават не былі ў медпункце. На жаль, штаб працоўных спраў універсітэта (камандзір У. Адамушка) раней не звярнуў на гэта належнай увагі.

***

Студэнцкія будаўнічыя атрады, якія едуць у ГДР, рапартавалі нядаўна аб поўнай гатоўнасці да выезду.

***

Больш як 50 студэнтаў універсітэта будуць працаваць важатымі на першай змене ў піянерскіх лагерах Мінскай вобласці.

***

Дэлегацыя піянераў з Брэста і Брэсцкай вобласці, якая ўдзельнічала ў рэспубліканскім злёце, прысвечаным 50-годдзю піянерскай арганізацыі, наведала наш універсітэт. Адбылася сустрэча юных ленінцаў з вучонымі, партыйным, камсамольскім і прафсаюзным актывам. Школьнікі наведалі выстаўку БДУ, азнаёміліся з гісторыяй універсітэта.

**Прэс-цэнтр камітэта камсамола.**

# ЗАСЛУЖАНАЯ АЦЭНКА

*Колькі было радасці ў той дзень, калі Анатоль Салькоў знайшоў сваё прозвішча ў спісе залічаных на гістарычны факультэт! Гэта было пяць год назад. У час вучобы ва універсітэце юнак настойліва папаўняў свае веды і актыўна займаўся камсамольскай работай. На другім курсе яго выбралі камандзірам студэнцкага будаўнічага атрада «Апейрон», а ў 1970 годзе ён разам з іншымі савецкімі студэнтамі працуе на будаўніцтве новага мікрараёна ў г. Іена (ГДР).*

*Сёння Анатоль Салькоў—дыпломнік. У яго такі ж бадзёры, радасны настрой, як і ў той далёкі дзень паступлення ў БДУ. Яго дыпломная работа «Барацьба БССР у сістэме ААН за універсальнае членства, міжнародную бяспеку, раззбраенне і ліквідацыю каланіялізму» (навуковы кіраўнік дацэнт Д. Б. Мельцар) атрымала высокую ацэнку дзяржаўнай камісіі. У даследаванні выкарыстан багаты матэрыял перыядычнага друку, архіўныя даныя. У рабоце прыведзена многа новых цікавых фактаў, якія маюць актуальнае значэнне.*

*Т. ЖАЛУДКО.*

## В А М, МАТЭМАТЫКІ

**Алгебра и анализ. Сборник статей. Ч. І. Л., 1972.**

**Башмакова, И. Т. Диофант и диофантовые уравнения. М., «Наука», 1972.**

**Вопросы прикладной математики. Сборник статей. Тбилиси, «Мецниереба», 1971.**

**Дальневосточный математический сборник. Хабаровск, 1971.**

**Движения в обобщенных дифференциально-геометрических пространствах. Сборник статей. Науч. ред. д-р физ-мат. наук, проф. И. П. Егоров. Пенза, 1971.**

**Джураев, А. Системы уравнений составного типа. М., «Наука», 1972.**

**Крылов, В. И. и др. Вычислительные методы высшей математики. Учебное пособие для факультетов прикладной математики университетов. Т. І. Минск, «Вышэйшая школа», 1972.**

**Осипова, Л. Н. Таблицы вырожденной гипергеометрической функции второго рода. М., 1972.**

**Рождественский, Б. А. Лекции по математическому анализу. (Для втузов) М., «Наука», 1972.**

**Соболь, И. М. Метод Монте-Карло. Изд. 2-е, испр. М. «Наука», 1972.**

# ЭКЗАМЕН ПЕРШЫ

Што ён прынясе тым, хто паступае сёння на завочны факультэт, пакуль што невядома, але пачатак зроблен. 6 чэрвеня філолагі, гісторыкі і юрысты пісалі сачыненне. Было прапанавана шмат тэм. Сярод іх: «Ленін, партыя і народ у паэме У. Маякоўскага «У. І. Ленін», «Партыі планы — нашы планы», «Саюз непарушны рэспублік свабодных» і інш.

Тыя, хто паступае на факультэт журналістыкі і аддзяленне філасофіі, здавалі гісторыю СССР, географы і біёлагі — адпаведна геаграфію і біялогію.

Сёння экзамены працягваюцца. Пажадаем жа абітурыентам па традыцыі «ні пуху, ні пер'я».

**Н. ПІНЧУК.**



**На здымках:** піянеры з Брэста і Брэсцкай вобласці, якія ўдзельнічалі ў рэспубліканскім злёце, у час знаходжання ў БДУ.

Фота **Д. Чаховіча.**



# ЗА ПРАВА БЫЦЬ СТУДЭНТАМ

Прыйшлі да фінішу заняткі на вячэрніх падрыхтоўчых курсах. На душы радасна і трывожна. Радасна ад таго, што мы ўсё ж прайшлі першае выпрабаванне — выпрабаванне на вытрымку і стараннe. Бо многія з нас не дайшлі да фінішу. Што грахі таіць, часта, вельмі часта падкрадвалася думка кінуць курсы і займацца самастойна. Усё ж цяжка пасля напружанага працоўнага дня ездзіць на заняткі. Хочацца пасля работы адпачыць, схадзіць у кіно, тэатр, на танцы. Але гэта ўжо ззаду. Цяпер трывожна ад таго, што наперадзе галоўнае — уступныя экзамены на права называцца студэнтам. У кожнага з нас свая запаветная мара. Марыя Данчык і Людміла Сабіч, напрыклад, хочуць стаць педагогамі, Мікалай Пратасавіцкі — юрыстам, а Валодзя Вішнякоў — журналістам. Збудзецца наша мара ці не—гэта ўжо залежыць ад нас.

Мы вельмі ўдзячны нашым выкладчыкам — студэнтам III курса філфака Алене Кагановіч, Валянціне Карневіч, студэнту гістфака Юліану Хітруку, якія дапамаглі нам паглыбіць свае веды па гісторыі, рускай мове і літаратуры.

Л. КРАСУЦКІ,
навучэнец падрыхтоўчых курсаў.

*Кінаагляд*

# ГЕРОІ—ЛЮДЗІ ПРАЦЫ

ПРАЦОЎНЫ чалавек... Чым адметны ён, сённяшні нашчадак сваіх папярэднікаў? Які ён, наследнік слаўных рэвалюцыйных традыцый, што знаходзіцца на перадавых рубяжах барацьбы за камунізм? Вечная тэма, актуальнасць якой непамерна ўзрасла ў апошні час. І нездарма яна так хвалюе майстроў літаратуры і мастацтва.

Дарэчы, аб гэтым ішла гутарка і на сустрэчы студэнтаў факультэта журналістыкі з кінадакументалістамі творчага аб'яднання «Летапіс» пры «Беларусьфільме».

— Галоўная праблема, над якой мы зараз працуем, — адзначыў у сваім выступленні рэжысёр І. Н. Вейняровіч,—вобразны паказ нашага сучасніка, чалавека працы, сапраўднага гаспадара зямлі.

Дакументальнае кіно — справа вельмі адказная ды і нялёгкая. Патрэбна ўгледзецца ў твар будучага героя кінастужкі, схапіць чалавечы характар, пастарацца потым на працягу 15—20 хвілін раскрыць яго на экране. І, галоўнае, увасобіць сваю задуму не фальшыва, а так, каб глядач верыў, імкнуўся быць падобным на герояў фільма або ў чымсьці лепшым за іх.

Зрэшты, можна прасачыць па апошніх дакументальных стужках, як ажыццяўляецца гэтая досыць складаная задача на экране, якія знаходкі і няўдачы спасцігаюць летапісцаў.

Наш сучаснік—індывідуальнасць творчая, актыўная. Менавіта гэтая думка ляжыць у аснове фільма «Шукай у сабе творцу» (сцэнарысты І. Яфрэмава і У. Дзвінскі, рэжысёр У. Дзвінскі).

Знікаюць апошнія цітры. На экране партрэт мужчыны ў камзоле XVIII стагоддзя, па-рыку, прыпудраным пылам гісторыі. Магчыма, гэта забыты намі ўмелец Андрэй Наратаў, токар пры двары Пятра І! Яшчэ адно імгненне, і пабач, у мантажным стыку, — другі партрэт. Хітравата прыжмураныя вочы, пытлівы позірк нашага сучасніка, звычайнага рабочага. Ажываюць кадры, аўтары фільма (у большай ступені гэта робіць сам герой) знаёмяць нас з беларускім вынаходнікам, стругальшчыкам Мінскага завода аўтаматычных ліній Леанідам Пратаповічам. Слушнае і, на маю думку, удалае супастаўленне кадраў як бы падкрэслівае пераемнасць продкаў і нашчадкаў, вынаходнікаў розных пакаленняў. Прыкметная зладжанасць, рытмічнасць дзеяння на экране імпануе дынаміцы расказу самога героя. Размова набывае форму шчырай, непасрэднай гутаркі з гледачом. Вынаходнік дзеліцца з ім сваімі радасцямі і няўдачамі. Праўда, асобныя эпізоды кінастужкі сваёй інсцэніраванасцю шкодзяць цікаваму ў цэлым фільму. Аднак увогуле ўдалося схапіць адметныя штрыхі партрэта вынаходніка, і ён не ператварыўся, як гэта часам бывае, у звычайны, а то і заштампаваны атрыбут раскрыцця задумы сцэнарыста і рэжысёра. Вобраз у фільме—якраз тая першааснова, той штуршок для нараджэння і развіцця думкі... Няўрымсліва кожны з нас павінен шукаць у сабе і адкрываць сапраўднага творцу!

Нешта аналагічнае імкнуліся сказаць стваральнікі фільма «Трактар учора, сёння, заўтра» (сцэнарыст і рэжысёр І. Цяўлоўскі, аператар Г. Лейбман). Гэта кінастужка аб праблемах сучаснага трактара, яго будучым. Беларускі трактар даўно набыў славу, заваяваў папулярнасць амаль на ўсіх кантынентах. Яго мінулае — на стэндах заводскага музея. Але чалавек не спыняецца на дасягнутым. Канструктары завода заўжды ў нястомным творчым пошуку. І кожная новая мадэль — яшчэ адзін крок наперад.

Аўтары, відаць, і спрабавалі паказаць сам працэс творчасці, штодзённых пошукаў. На працягу ўсяго фільма кінакамера не зводзіць «вачэй» з трох чалавек, рассаджаных рэжысёрам за сталом. Глядзіш на экран, і нагадваюць нястомныя шукальнікі непаваротлівых робатаў, бо здаецца, нішто чалавечае не ўласціва гэтым людзям: яны толькі нешта гавораць ды паказваюць адзін аднаму чарцяжы. Так і застаецца незразумелым, што хацелі сказаць аўтары фільма.

Тое ж самае атрымалася са стужкай «Супрацоўнік крымінальнага вышуку» (сцэнарыст і рэжысёр-пастаноўшчык Арсен Ястрабаў). Шчыра кажучы, па тых агрэхах, што спадарожнічаюць ім абодвум, гэтыя фільмы — блізняты. Хіба ў тым толькі і адрозненне апошняга, што аўтар імкнуўся паказаць свайго героя ў дзеянні. Але што ні робіць герой фільма, пераканаўчай псіхалагічнай асновы яго дзеяння мы не бачым.

Куды больш проста і запамінальна можна расказаць аб чалавеку, калі кожны крок сцэнарыста і рэжысёра прадуманы і застаецца толькі апошняе слова за апаратарам, кінакамерай: каб галоўны герой фільма паўстаў перад гледачом натуральным, звычайным і ў той жа час шматгранным, як у паўсядзённым жыцці, са сваімі адметнымі рысамі і хібамі, а не саладжава прыхарошаным, ідэальным.

І ў гэтым пераканаешся, прагледзеўшы фільм «Пераемнік» (сцэнарыст і рэжысёр І. Вейняровіч), які расказвае аб новым старшыні вядомага калгаса «Рассвет», што на Магілёўшчыне, Герою Сацыялістычнай Працы Васілю Канстанцінавічу Старавойтаву, пераемніку нястрымнага Кірылы Арлоўскага.

Фільм — апафеоз працы хлебароба. Ёсць у ім настрой, нейкія лірычныя інтанацыі, што недзе схаваны па-за кадрам, але прасочваюцца, даходзяць да гледача. Герой давяраецца нам, і мы разам з ім хвалюемся, перажываем. Разумеем старшыню, які ідзе па шырокаму ўзаранаму полю. Твар задумлівы. Усё-такі цяжка ўзваліць на сябе такую махіну — кіраваць калгасам, які грыміць славай.

Добра, што аўтар фільма дае магчымасць гледачу прасачыць за такім станам. Але хацелася б, каб герой больш поўна раскрыўся перад намі: што ён за чалавек, які ў яго характар, да чаго імкнецца...

«Мой тата—Айбаліт» (сцэнарыст і рэжысёр У. Дзвінскі) і «Беларуская казка» (сцэнарыст В. Адамчык, рэжысёр А. Канеўскі) прадаўжаюць тую ж самую тэму, аб якой ідзе гаворка. Аднак у фільме «Мой тата — Айбаліт» яна пададзена па-другому, праламляецца ў іншым кірунку, бо сам фільм прапануецца малодшаму гледачу — дзецям. Але яго з задавальненнем паглядзяць і дарослыя. Шкада толькі, што юны герой, сын сельскага ветурача, якому, на маю думку, варта было адвесці галоўную ролю, адціснут сталай, каржакаватай постаццю ветэрынара на задні план.

«Беларуская казка» — каляровая стужка — узнёслы гімн творчым рукам чалавека, народным беларускім умельцам, майстрам саломкі.

Названыя стужкі (за выключэннем некаторых) — крокі беларускай кінадакументалістыкі на шляху стварэння вобразаў нашых сучаснікаў, нястомных шукальнікаў і творцаў.

**М. БАСАК.**

## ХРОНІКА ГОДА КНІГІ

● «Міжнародны год кнігі, — гаворыцца ў пасланні генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Рэнэ Майо, апублікаваным у шостым нумары бюлетэня ЮНЕСКА «1972. Міжнародны год кнігі». — гэта перш за ўсё справа мільёнаў простых людзей, для якіх чытанне кнігі — ці з'яўляецца яна часткай іх паўсядзённай працы, сродкам самаадукацыі ці крыніцай адпачынку... — неаддзельна ад шчасця і дастойнага характару жыцця».

● Пасол СССР у Тунісе С. А. Афанасьеў перадаў у якасці падарунка Нацыянальнай бібліятэцы Туніса Поўны збор твораў У. І. Леніна на французскай мове. Дырэктар бібліятэкі доктар Бешыр эль-Фані падзякаваў савецкаму паслу за гэты дар.

● Вядомы індыйскі пісьменнік Мулк Радж Ананд, наведаўшы савецкі павільён на Міжнародным кніжным кірмашы ў Дэлі, сказаў у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС: «Пабываўшы тут, выразна ўяўляеш, наколькі вялікае значэнне кнігі ў жыцці савецкіх людзей. Савецкі Саюз сапраўды буйнейшая кніжная дзяржава свету».

● Працы У. І. Леніна, творы савецкіх аўтараў аб Афрыцы, пераведзеныя на рускую мову кнігі афрыканскіх пісьменнікаў знайшлі віднае месца ў экспазіцыі выстаўкі, прайшоўшай у сталіцы Сенегала — Дакары з выпадку Міжнароднага года кнігі. З вялікай цікавасцю наведвальнікі знаёміліся таксама з першымі выданнямі на мовах народаў Афрыкі.

● Дваццацімінутны каляровы тэлевізійны фільм, які ЮНЕСКА рыхтуе ў сувязі з Міжнародным годам кнігі, паказвае становішча выдавецкай і бібліятэчнай справы ў многіх краінах свету. Гэты фільм будзе суправаджацца каментарыямі на рускай, англійскай, французскай і іспанскай мовах.

● Ва ўсіх дзевяці правінцыях Аўстрыі праводзяцца кангрэсы, прысвечаныя пытанням чытання, і перасоўныя кніжныя выстаўкі, у экспазіцыі якіх прадстаўлена 250—300 новых выданняў. Адзначаючы Міжнародны год кнігі, аўстрыйскі Інстытут дзіцячай, юнацкай і масавай літаратуры рыхтуе анатаваную бібліяграфію дзіцячых кніг, выдадзеных ва ўсім свеце.

● У год кнігі вялікай папулярнасцю ў Рэспубліцы Чад карыстаецца нядаўна аддрукаваны ў Нацыянальнай друкарні зборнік апавяданняў, напісаных чытачамі ў адказ на конкурс, арганізаваны часопісам «Чад і культура». Новая кніга — першае падобнае выданне ў краіне. «Гэты скромны зборнік, — піша ў прадмове прэзідэнт Рэспублікі Чад Франсуа Томбалбайе,—з'яўляецца толькі прэлюдыяй да сімфоніі, якая будзе народжана на нашай зямлі. Няхай чытачы зборніка не абмяжоўваюцца толькі яго прачытаннем, а самі запішуць легенды, гісторыі, байкі сваіх пасёлкаў і тым самым прадоўжаць пачэсную справу, распачатую гэтай кнігай».

● Асноўная падзея Міжнароднага года кнігі ў Бірме — Тыдзень літаратуры. У яго межах арганізуецца вялікая выстаўка, прысвечаная кнігам бірманскіх выдавецтваў за многія гады. Кульмінацыяй Тыдня стане Дзень Міжнароднага года кнігі, у час якога будуць уручаны літаратурныя прэміі. Адбудзецца таксама семінар «Шлях кнігі ад пісьменніка да чытача».

● Нацыянальная праграма Міжнароднага года кнігі Дэмакратычнай Рэспублікі Конга прадугледжвае здзяйсненне выданняў, а таксама запісаў на магнітафонную плёнку, якія захаваюць багацці вуснай народнай творчасці. Асаблівая ўвага ў краіне ўдзяляецца выпуску літаратуры для дзяцей аб Афрыцы, таму што, на думку выдаўцоў і прапагандыстаў кнігі, дзеці перш за ўсё павінны пазнаваць свой кантынент.

● 30 красавіка 1972 года споўнілася 80 год з часу заснавання Бібліятэчнай асацыяцыі Японіі. Гэты дзень аб'яўлен нацыянальным днём бібліятэк.

ЗДЫМАЕ ВІКТАР ЖУК



НАСТРОЙ



## САМІ СЯБЕ ПАКАРАЛІ

Не чакаў вадзіцель аўтакалоны № 2415 У. Кароткі, што здарыцца няшчасце. На сваім ЗІЛе-585 Валодзя працуе ўжо не першы год. Машыну захоўвае заўсёды ў належным стане. І раптам, праязджаючы пры зялёным сігнале светафора на скрыжаванні вуліц Ульянаўскай і Кастрычніцкай, ён убачыў, як наперарэз машыне кінуліся перабягаць вуліцу дзве дзяўчыны. Шафёр уключыў тармазы, але пазбегнуць наезду не змог. Хто ж гэтыя дзяўчаты? Магчыма мы і не даведаліся б аб іх прозвішчах, калі б яны не трапілі ў бальніцу. А пагарджалі чырвоным сігналам светафора студэнткі БДУ В. Дзікун і Г. Жураўлёва.

**М. АЛІСІЕНАК,**
**ст. дзяржінспектар Кастрычніцкага РАУС.**

ПЕШАХОД І ВУЛІЦА

## ЗДАРЭННЯЎ МОЖА І НЕ БЫЦЬ...

Праз Ленінскі праспект ішла дзяўчына. Ішла не спяшаючыся, спакойна, не звяртаючы ўвагі на прабягаючыя машыны і сярдзітыя позіркі вадзіцеляў.

А па той бок вуліцы дзяўчыну ўжо чакаў міліцыянер... Я адчуваю, як у некага бліснула міжвольная ўсмешка: «Ну-ну...» Хтосьці, напэўна, успомніў словы вядомай песенькі пра старшыну міліцыі з маскоўскай Таганкі.

Не, тут было інакш. Гэты старшына не «застыў на месцы», а ветліва прапанаваў дзяўчыне «раскашэліцца» на 10 рублёў за парушэнне правіл бяспекі руху.

Было гэта 23 мая. Калі студэнтка матэматычнага факультэта Людміла Верна прачытае гэты матэрыял, яна, канешне, пазнае сябе ў той дзяўчыне-парушальніцы.

Мне не давялося прысутнічаць у той момант, калі вы, Людміла, разлічваліся з міліцыянерам, але я ўяўляю ваша становішча: не так проста выкінуць са свайго больш чым сціплага студэнцкага бюджэту 10 рублёў. Магчыма, вы нават абурыліся: за што штраф, я ж нічога не зрабіла, толькі вуліцу перайшла не там, дзе трэба.

А ўсё ж вельмі танна вам абышлася гэта прагулка праз вуліцу. У доказ прывяду зусім нядаўняе здарэнне з другой дзяўчынай, таксама студэнткай універсітэта Марыяй Зубец. Пераходзячы вуліцу, яна таксама была пераканана, што нічога асаблівага не робіць, хоць бачыла, што светафор падае забараняючы сігнал: ісці нельга, можа быць няшчасце. Так яно і здарылася. Марыя была збіта матацыклам. З цяжкімі цялеснымі пашкоджаннямі яна дастаўлена ў бальніцу.

Можна ўявіць і яе становішча. Нялёгка быць прыкаванай да ложка, калі твае аднакурснікі атрымліваюць дыпломы, нялёгка ўсведамляць, што на доўгі час страчана працаздольнасць.

Вельмі часта парушальнікам правіл бяспекі руху прыходзіцца раскайвацца ў сваіх учынках. І ўсё ж, няправільна пераходзячы вуліцу, мы рэдка задумваемся над тым, да чаго гэта можа прывесці.

Праглядаючы пратаколы, дзе запісаны тлумачэнні парушальнікаў, часам здзіўляешся: да чаго лёгкадумныя, малаважныя прычыны, штурхнуўшыя да парушэння правіл вулічнага руху.

— Я перайшла дарогу, дзе ўсе пераходзяць, — заявіла студэнтка Лена Савіцкая.

— Спяшаўся ў магазін. Мяне вельмі чакалі УСЕ, — растлумачыў Станіслаў Сіманькоў.

Ці патрэбны тут каментарыі? І ўсё ж хацелася б напомніць Лене, што пераходзіць вуліцу патрэбна не там, дзе ўсе гэта робяць, а там, дзе ёсць указальнікі пераходу і спецыяльныя дарожныя разметкі.

Ну, а Станіславу і так стане зразумела, што ў наступны раз пры падобных абставінах УСЕ яго могуць і не дачакацца.

**Р. АЎРАМЕНКА,**
**інструктар ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 01260
Заказ 676.
Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
Тыраж 2 000 экз.